**Віншуем**



# Адданасць Беларусі

**Акадэміку і члену-карэспандэнту Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прафесару Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, аўтару звыш тысячы навуковых публікацый, вядомаму культурнаму і грамадскаму дзеячу Анатолю Пятровічу Грыцкевічу 31 студзеня спаўняецца 80 гадоў.**

Ёсць людзі, якія ўмеюць аддаць усю сваю мудрасць на службу высакародным справам. Людзі, для якіх сумленнасць і лаяльнасць з'яўляюцца самымі важнымі рысамі. Людзі, якія ўмеюць спрацаваць культурна, нягледзячы на ўзровень і погляды суразмоўцы.

Анатоль Грыцкевіч — з такіх. Вялікі беларус, вялікі еўрапеец, інтэлігент, выбітны гісторык.

Нарадзіўся ён у Мінску, хаця ягоны род паходзіць са Случчыны, дзе продкі яго жылі на працягу некалькіх стагоддзяў. Скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (1950), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (1955), гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1958). З 1959 г. — у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук БССР, з 1975 г. да 2007 г. узначальваў кафедру гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, быў загадчыкам аддзела Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны.

З 1996 г. да 2000 г. Анатоль Грыцкевіч быў дырэктарам навукова-даследчага Інстытута Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў Мінску. У 1998 г. Міжнародным Кембрыджскім біяграфічным цэнтрам за навуковыя дасягненні ён прызнаны "чалавекам года". З 1991 г. — сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, з 1995 г. — ганаровы сябра Таварыства беларускай культуры ў Літве. Анатоль Пятровіч з'яўляецца адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, старшынёй Камісіі "Славутыя імёны Бацькаўшчыны" ў Беларускім фондзе культуры.

Навуковыя інтарэсы А. Грыцкевіча шматстайныя. Менавіта праф. Грыцкевіч увёў у беларускую гістарыяграфію вызначэнне Рэчы Паспалітай як федэрацыі дзвюх раўнапраўных дзяржаў — Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Анатоль Грыцкевіч адным з першых у Беларусі пачаў пісаць спецыяльныя працы па палітычнай і вайсковай гісторыі Беларусі ў XIV — XVIII стст. Ёсць у яго шэраг публікацый па гісторыі беларускіх татар, гісторыі Беларусі 1918 — 1920 гг., гісторыі роднай Случчыны. Больш як сотня артыкулаў прысвечаны генеалогіі беларускіх і літоўскіх шляхецкіх родаў, уключна з уласным родам, які прасочаны ажно з XVI ст.

А. Грыцкевіч — вядомы гісторык рэлігіі, цэркваў у Беларусі, перш за ўсё Каталіцкай, Грэка-Каталіцкай, Праваслаўнай, а таксама пратэстанцкіх цэркваў. Адна з яго вялікіх прац па гэтай праблематыцы была выдадзена на англійскай мове ў Рыме ў 1992 г.

У Еўропе прафесар Грыцкевіч вядомы як выдатны беларускі гісторык, чыя навуковая непрадузятасць спалучаецца з гарачай адданасцю Беларусі. Несумненна, мой зямляк прафесар Анатоль Грыцкевіч належыць да тых людзей, якія не толькі ствараюць станоўчы імідж нашай нацыі, але і непасрэдна будуюць яе.

Любоў УЛАДЫКОЎСКАЯ